производственно-технологической практики» [4]. Студенты нашего факультета закрепляют теоретические знания практической деятельностью во время практик на базах туристических сообществ, туристических компаний, в том числе Министерства спорта и туризма.

Видится необходимым организация практико-ориентированного обучения с первого курса. Внимание отводить не только к различным видам практик, но и включение студентов к дополнительному и самостоятельному образованию, а также привлечение студентов к участию в волонтерских проектах.

При последовательном и грамотном выстраивании практико-ориентированного обучения будет достигнута цель в подготовке специалиста, обладающего необходимым набором компетенций.

1. Андреев, А.Л. Компетентностная парадигма в образовании: опыт философско-методологического анализа / А.Л. Андреев // Педагогика. – 2005. - №4. – С. 18-27.

2. Культурный туризм и подготовка студентов-менеджеров к работе в поликультурном регионе: Монография / составитель: Е.Н. Егорова. – Краснодар: Экоинвест, 2017. – 164 с.

3. Мастеница, Е.Н. Музей и турист: управление процессом межкультурной коммуникации / Е.Н. Мастеница, Л.М. Шляхтина // Менеджмент. Наука. Образование. Культура ;сб.научн.тр. / Санкт-Петербургский гос. университет культутры и искусств. – СПб.: СПбГУКИ, 2003 – С. 194 – 208.

4. Пирогова, О.В. Практико-ориентированное обучение студентов в туристском Вузе / О. В. Пирогова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://interactive-science.media/ru/article/119643/discussion_platform. – Дата доступа: 24.01.2018.

5. Рансбергер, М. Тенденции развития европейского культурного туризма шансы, риски и перспективы / М. Рансбергер // Вестник Сочинского гос. ун-та туризма и курортн. дела. – 2009. – №3 (9). – С. 99-102.

6. Туризм [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/ru/tourism_ru/. – Дата доступа: 01.02.2018.

## ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ: АРГАНІЗАЦЫЙНЫ АСПЕКТ.

***Яцэвіч М.А.****, дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Часта практыка-арыентаваную адукацыю разумеюць у вузкім значэнні гэтага слова, а менавіта, як засваенне тэарэтычных ведаў падчас вучэбнай, вытворчай практыкі і правядзенні асобных практычных заняткаў у бібліятэках. Насамрэч, гэтае паняцце больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складанае і сістэмнае. Размова ідзе пра механізмы ўзаемадзеяння паміж універсітэтам і бібліятэкамі, інфармацыйнымі цэнтрамі, іншымі ўстановамі і арганізацыямі сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый, якія выступаюць у якасці заказчыкаў кадраў. Заказчыкі кадраў уплываюць на змест, формы, метады і арганізацыю адукацыйнага працэсу.

Разгледзім асноўныя накірункі такога ўзаемадзеяння.

*Вызначэнне патрэб у кадрах.* Навукова-вытворчае абгрунтаванне патрэб ў бібліятэчных спецыялістах яшчэ патрабуе свайго вырашэння. Перспектыўныя планы такіх патрэб часта складаюцца фармальна, без належнага абгрунтавання, уліку асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, бягучасці кадраў, тэндэнцый укаранення сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, якія непасрэдна ўздзейнічаюць на развіццё бібліятэк. Вызначэнне патрэб у спецыялістах, карэкціроўка адпаведных планаў праводзіцца установай адукацыі сумесна з бібліятэкамі і органамі дзяржаўнага кіравання. Гэта з’яўляецца асновай для вызначэння ўстановай адукацыі кантрольных лічбаў набору студэнтаў з ўлікам яе магчымасцяў, а для бібліятэк − фарміравання заказу на падрыхтоўку спецыялістаў і іх эфектыўнага выкарыстання на працоўных месцах.

У Беларусі нарматыўнае вызначэнне патрэб і фарміраванне заказу грунтуецца на “Палажэнні аб парадку прагназавання патрэбнасцяў у працоўных рэсурсах для фарміравання заказу на падрыхтоўку спецыялістаў, рабочых, служачых”, зацверджанага Саветам Міністраў (2011 г.). Фарміраванне заказу адбываецца з выкарыстаннем спецыяльнай аўтаматызаванай сістэмы, інфармацыйнае напаўненне і парадак функцыянавання якой вызначаецца сумесна міністэрствамі адукацыі і працы. Бібліятэкі рэгіструюць у сістэме заказ на падрыхтоўку спецыяліста.

*Сумесная падрыхтоўка спецыялістаў.* Практыка-арыентаванае навучанне мае сваёй мэтай засваенне студэнтамі адукацыйнай праграмы не толькі ў аўдыторыі, а ў асяроддзі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, фарміраванне ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый (як агульнапрафесійных, так і спецыяльных) за кошт выканання імі рэальных практычных задач падчас вучэбных заняткаў ва ўмовах адпаведных бібліятэк. Апошнія выступаюць у якасці базавых арганізацый. У Беларусі на дзяржаўным узроўні створана нарматыўна-прававая база такога ўзаемадзеяння. Пастановай Савета Міністраў зацверджана “Палажэнне аб базавай арганізацыі ўстановы адукацыі” і прыкладная форма “Дамовы аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі з арганізацыяй-заказчыкам кадраў пры падрыхтоўцы спецыялістаў, рабочых і служачых” (2011).

Асноўнымі мэтамі ўзаемадзеяння з’яўляюцца: удасканаленне адукацыйнага працэсу і павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

улікам патрабаванняў інавацыйнага развіцця бібліятэчнай справы; забеспячэнне высокага ўзроўню правядзення вучэбнай і вытворчай практыкі, практычных заняткаў, падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ па заяўках бібліятэк; прафесійная падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі бібліятэкараў і супрацоўнікаў установы адукацыі.

БДУКМ заключыў такія дамовы з 25 бібліятэкамі краіны: Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, рэспубліканскімі галіновымі бібліятэкамі, абласнымі, буйнейшымі цэнтралізаванымі бібліятэчнымі сістэмамі, бібліятэкамі асобных універсітэтаў. Сутнасць такіх дамоваў заключаецца ў тым, што бібліятэкі-базавыя арганізацыі могуць непасрэдна ўплываць на змест і віды адукацыйных праграм з улікам сваіх патрэбнасцей, а ўстанова адукацыі забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў у колькасці, вызначанай у дамове аб узаемадзеянні, і накіроўвае іх на працу ў базавую арганізацыю. Каштоўнасць такіх дамоваў асабліва праяўляецца падчас накіравання студэнтаў на працу, калі ідзе спаборніцтва за кожнага спецыяліста ў сувязі з тым, што колькасць заявак ад бібліятэк перавышае колькасць выпускнікоў. У дадзеным выпадку перавага аддаецца тым бібліятэкам, якія заключылі дамовы аб узаемадзеянні.

Дамовы аб ўзаемадзеянні ўстановы адукацыі і бібліятэкі-базавай арганізацыі дазваляюць таксама ствараць ў буйнейшых бібліятэках сумесныя вучэбна-навукова-вытворчыя комплексы, філіялы кафедраў. У 2017 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пачаў сваю працу філіял кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый. Распрацаваны неабходныя нарматыўныя дакументы: палажэнне аб філіяле кафедры, сумесная дамова паміж ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі і БДУКМ аб стварэнні кафедры; план работы філіяла кафедры па наступных накірунках – арганізацыйная работа, вучэбна-метадычная работа, сацыя-культурная дзейнасць, прафарыентацыйная работа; прызначаны адказныя за работу філіяла.

Ужо ёсць першыя вынікі функцыянавання філіяла: супрацоўнікамі ЦНБ імя Я.Коласа праведзены семінары-трэнінгі для выкладчыкаў кафедры па выкарыстанні сусветных інфармацыйных рэсурсаў, а таксама ўласнай генерацыі; па выкарыстанні баз даных цытавання для правядзення бібліяметрычных даследаванняў.

Распрацаваны графік правядзення практычных заняткаў на базе інфармацыйных рэсурсаў ЦНБ па дысцыплінах “Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы”, “Інфармацыйныя рэсурсы навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы”. Студэнты непасрэдна ўключаюцца ў вытворчы працэс бібліятэкі, напрыклад, ажыццяўляюць аналітычны роспіс дакументаў у фармаце BelMARC і далучэннем іх да нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў. Безумоўна, усё гэта адбываецца пад кантролем выкладчыка і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супрацоўніка бібліятэкі. Па заяўцы бібліятэкі выконваюцца некалькі дыпломных работ.

ЦНБ выступае ў якасці рэцэнзента вучэбна-метадычных матэрыялаў кафедры: вучэбна-метадычных комплексаў, вучэбных праграм і інш. Кіраўнікі бібліятэкі у якасці старшынь і членаў далучаюцца да работы дзяржаўных экзаменацыйных камісій, абароны дыпломных прац. Супрацоўнікі бібліятэкі выступаюць рэцэнзентамі дыпломных работ і магістарскіх дысертацый. З іншага боку, супрацоўнікі факультэта ўдзельнічаюць у аттэстацыйных камісіях ЦНБ. На базе бібліятэкі праходзяць усе віды практык: вучэбная, тэхналагічная, праддыпломная. Студэнты і магістранты працуюць на палову стаўкі ў бібліятэцы, а потым, як правіла, атрымоўваюць размеркаванне на працу ў гэтую бібліятэку.

Асабліва неабходна адзначыць сумеснае правядзенне ФІДК і ЦНБ штогадовай (ужо 10-й па ліку) міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных і спецыялістаў, на якой з дакладамі выступаюць маладыя выкладчыкі, аспіранты, магістранты і студэнты факультэта. У кастрычніку 2018 г. сумесна таксама быў арганізаваны і праведзены навуковы семінар “Сучасныя праблемы кніжнай культуры: асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця”, які адбыўся ў Дзелавым культурным комплексе Амбасады Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, г. Масква.

Студэнты удзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні культурна-дасугавых мерапрыемстваў у ЦНБ: “Бібліяноч”, сустрэчы са знакамітымі людзьмі, правядзенне інтэлектуальных даследаванняў, напрыклад, “Элементарно? Справа полацкага друкара” Францыска Скарыны.

Для рэалізацыі вышэйазначаных мэтаў узаемадзеяння *ўстанова адукацыі* ажыццяўляе наступнае: забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў; арганізуе сумесную прафарыентацыйную работу; уключае ў склад дзяржаўных экзаменацыйных камісій прадстаўнікоў базавай арганізацыі; далучае прадстаўнікоў базавай арганізацыі да экспертызы адукацыйных стандартаў і тыпавых вучэбных планаў; распрацоўкі (узгаднення) вучэбных праграм; практыка-арыентаваных заданняў, накіраваных на фарміраванне адпаведных агульнапрафесійных і спецыяльных кампетэнцый; накіроўвае педагагічных работнікаў на стажыроўку ў базавую арганізацыю; праводзіць сумесныя навукова-метадычныя даследаванні, праекты, канферэнцыі, сацыя-культурныя праграмы і г.д. *Бібліятэка-базавая арганізацыя* − мае прыярытэт на атрыманне маладых спецыялістаў; уносіць прапановы па наменклатуры напрамкаў спецыяльнасці “бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць”, зместу вучэбных праграм; забяспечвае правядзенне вытворчай практыкі, розных відаў вучэбных заняткаў; прапаноўвае тэматыку курсавых і дыпломных работ: аказвае інфармацыйную падтрымку ўстанове адукацыі па пытаннях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інавацыйнага развіцця бібліятэчнай справы, укаранення сучасных тэхналогій абслугоўвання карыстальнікаў; ажыццяўляе сумесную прафарыентацыйную работу; сумесна з установай адукацыі арганізуе вывучэнне якасці падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў.

*Ацэнка задавальнення спажыўцоў*. Гэты кірунак узаемадзеяння дазваляе выявіць ступень задавальнення бібліятэк узроўнем падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў ва ўстанове адукацыі пасля іх прафесійнай адаптацыі на працягу аднаго года працы. Такі маніторынг праводзіцца ў бібліятэках у межах сістэмы менеджменту якасці БДУКМ з дапамогай спецыяльна распрацаваных анкет, апытанняў і інш. Атрыманая адваротная інфармацыя з’яўляецца асновай для карэкціроўкі і ўдасканалення адукацыйных праграм рознага ўзроўню па спецыяльнасці “бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць”. Вынікі маніторынгу выкарыстоўваюцца для распрацоўкі плана мерапрыемстваў па ліквідацыі праблемных пытанняў у падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў.

На факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ назапашаны значны вопыт пасяховага ўзаемадзеяння з бібліятэкамі-заказчыкамі кадраў па ўсіх разгледжаных вышэй накірунках.

## МОДЕЛИ И ФОРМЫ ОРГАНИЗАЦИИ ПРАКТИКО-ОРИЕНТИРОВАННОГО ОБУЧЕНИЯ ПРИ ПОДГОТОВКЕ БИБЛИОТЕЧНО-ИНФОРМАЦИОННЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ

***Галковская Ю.Н.**, заведующий*
*кафедрой библиотечно-*
*информационной деятельности,*
*кандидат педагогических наук,*
*доцент*

На современном этапе актуальным является идентификация и критический анализ моделей и форм практико-ориентированного обучения. В зарубежной теории обучения отмечается, что знание должно строиться через «reallife experience» (S. Merriam, 2007) [3], через практическое, совместное обучение (S. Cannon, C. Boswell, 2016) [2].

Предполагается, что современное высшее образование должно давать обучающимся фундаментальную теоретическую подготовку в совокупности с практическим опытом, позволяющим решать стандартные и нестандартные профессиональные задачи на основе систематизированных знаний и сформированных практических умений. Многие специалисты отмечают, что информация обучающимися плохо обрабатывается, усваивается и сохраняется,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ